Віленскі беларускі музэй імя Івана Луцкевіча: бюлетэнь

ПАДЗЕІ АРХІЎ

ліпень
2026

Летняя дысацыяцыя

Адчынілася выстава летней дысацыяцыі: пленэрныя малюнкі М. Знаміроўскага (сына вядомага польскага мастака) са збору Аляксея Анішчыка й пабытовыя летнія здымкі апошняга. Іх спалучэньне добра перадае па думцы куратаркі Паўліны Вітушчанкі летняе пачуццьцё страчанасьці ды ірэальнасьці сусьвету, занадта для нас прыгожага. Публіка ў захапленьні: “Выстава цудоўная ад канцэпцыі да самых дробязаў “. Цудоўная выстава працягнецца да сярэдзіны жніўня. Выпуск каталёгу не плянуецца.

Ляймэнскія справы

Ідзе падрыхтоўка да выставы Музэй Попкі. Выстава плянуецца ў верасьні. Плян яе — паказаць поўны збор да адбракоўкі непатрэбнага музэю так, кабы наведнік мог сабе ўявіць, якім быў музэй у Ляймене й падумаць аб лёсе збору, які застаецца без спадкаемцаў.

ЗБОР

Пачаўся збор інтэрв’ю аб сьвяткаваньні Куцьці. Праект зьбірае дадзеныя ад беларусаў, літоўцаў і палякаў. Запісаны кароткія інтэвр’ю з Людвікай Кардзіс, Сяргеем Харэўскім, Галінай Сівалавай, Дар’яй Гардзейчык і так сама тры літоўскія інтэрв’ю. Запісы зьбірае Ільля Магін (Тартускі універсытэт) для сумеснага праекта з Джорданам Чадам (Універсытэт Таронта). Далей плянуецца он-ляйн анкетаваньне.

ГОСЬЦІ

Госьці з Нямеччыны, Італіі, і інш.

Дасьледчыца тэатру Таня Арцімовіч завітала ў архіў “Талакі”, зацікаўленая тэатральнай спадчынай суполкі — сцэнарамі й фотадакумантацыяй батлеек і сьвятаў. Пакуль знойдзена няшмат, але праца будзе працягнутая.

Таксама музэй наведаў нарвескі палеантоляг, беларуска з Сардыніі, і аўстрыйскі студэнт - дасьледнік справаў Рэчы Паспалітай, які з дапамогай бібліятэчных кніг намераны пашыраць свае ўжо ісьнеючыя веды беларускай мовы.

Лісты зь Нямеччыны

У дадатак да экспанатаў, да музэю дабралася карэспандэнцыя Юрыя Попкі. Пачаты разбор і каталягізацыя. У зборы зьвяртаюць на сябе ўвагу незвычайныя паштоўкі з сушанымі вожыкамі.

Вечныя зіны

Пачата дыгіталізацыя архіву Талакі: лічбуюцца перыёдыкі, зараз выкладзена ў сеціва 38 перыёдыкаў 1988-2002 гадоў, сяродзь іх рэдкія ўлёткі, 4 перыёдыка на вічскай мове Дзукіі, легендарны зін “На канапе”, насьценгазэта “Талакі” й інш. Сьпіс адлічбываных выданьняў складаецца тут: https://mastul.blogspot.com/2026/07/work-in-progress.html

Хвалі ў этэры

Дыгіталізаваны запісы перадач радыва “Балтыцкія хвалі” (2000-2001). Зараз у сеціве можна паслухаць перадачы “Звычайны фэмінізм”, “Літва пасьля камунізму” ды “Віленскі музэй”. Матэрыялы перадала Тацьцяна Поклад. ВБМ працягвае зьбіраць вусныя ўспаміны пра бел. радыва й заклікае дасылаць іх музэю.

АХВЯРАВАНЬНІ

1,2%

На гэты год суполка падтрымкі музэю зноў пабіла ракорды, сабраўшы з падатковых 1,2% ахвянаваньні на 19 312 эўраў. Сабраная сума дазволіць аплочваць арэнду музэю, камунальныя паслугі, заняткі для дзяцей і дарослых.

Грашовыя ахвяраваньні за месяц склалі 78 эўраў. Музэй плянуе набываць на іх каву, кабы частаваць неведнікаў.

РЭКЛЯМА



Музэй прапануе мёд з Падбродзьдзя. 500 грамовы слоік каштуе 5 эўраў. Атрымаць можна ў любы час у памяшканьні бібліятэкі, пакінуўшы грошы замест слоіка.